Дайджэст

У ГРЭНЛАНДЫІ ЗАЎВАЖЫЛІ КЛІМАТЫЧНУЮ КАТАСТРОФУ

Міжнародная група навукоўцаў высветліла, што на гэтым найвялікшым у свеце востраве за апошнія дзесяцігоддзі значна паскорыліся тэмпы раставання лёду. Прычынай з'яўляецца глабальнае пацяпленне, выкліканае антрапагеннымі выкідамі парніковых газаў, паведамляе Phys.org.

Даследчыкі прааналізавалі даныя радыёлакацыйнай альтыметрыі, атрыманыя з дапамогай спадарожнікаў дыстанцыйнага зандзіравання ERS, Envisat і CryoSat. Гэты метад дазваляе вызначыць таўшчыню ледзянога покрыва, а таксама змены ў ім з цягам часу. Высветлілася, што ў пачатку 1990-х гадоў вышыня ледзяных шапак у Грэнландыі змянялася нязначна, аднак з 2003-га яна стала імкліва змяншацца. Аб'ёмы лёду скарачаюцца ў заходняй, паўночна-заходняй і паўднёва-ўсходняй частках ледавіковага шчыта, у той час як на поўначы таўшчыня застаецца больш стабільнай.

Паводле слоў навукоўцаў, гэта дэманструе высокую адчувальнасць ледавікоў Грэнландыі да антрапагеннай змены клімату. Талая вада, якая сцякае ў Атлантычны акіян, уплывае на цыркуляцыю вады ў ім, а таксама спрыяе павышэнню ўзроўню мора.



ІТАЛЬЯНЦЫ СТАРЭЮЦЬ ТОЛЬКІ ПАСЛЯ 75

Старасць у Італіі адкладваецца: навукоўцы з Фларэнтыйскага ўніверсітэта прыйшлі да высновы, што пажылымі італьянцы становяцца толькі пасля 75 гадоў.

Згодна з іх назіраннямі, сённяшнія 65-гадовыя італьянцы па фізічных і разумовых паказчыках адпавядаюць 40—45-гадовым людзям 1980-х гадоў. А на 55 гадоў людзі пачынаюць адчуваць сябе толькі да 75 гадоў. Тыя, хто нарадзіўся ў пачатку XX стагоддзя, жылі ў сярэднім па 60—65 гадоў, таму ў 50 ужо маглі лічыцца старымі. З тых часоў чаканая працягласць жыцця ў Італіі павялічылася да 85 гадоў для жанчын і 81 года ў мужчын. Пры гэтым італьянцы даўжэй захоўваюць здароўе і самастойнасць — 50 % жыхароў Італіі ва ўзросце 75—84 гадоў спраўляюцца з паўсядзённымі справамі без старонняй дапамогі.

Улады пакуль ніяк не адрэагавалі на гэтую заяву навукоўцаў. Між тым у многіх еўрапейскіх краінах пенсійная сістэма падладжваецца пад працягласць жыцця грамадзян, якая якраз такі павялічваецца. Напрыклад, у Нідэрландах за пяць гадоў пенсійны ўзрост плануюць падняць да 67 гадоў і трох месяцаў, а ў Бельгіі акрамя павышэння пенсійнага ўзросту пажылым спецыялістам будуць прапаноўваць падпрацоўваць на пенсіі на паўстаўкі.



ДАТЧАНЕ БУДУЦЬ КАТАЦЦА НА САБАКАХ ПА АЎТАДАРОГАХ

Міністэрства транспарту Даніі прызнала сабачыя запрэжкі афіцыйным відам транспарту, паведамляе выданне «Еўрапульс».

З 1 студзеня 2019 года ў Даніі на запрэжках можна будзе ездзіць па аўтадарогах і побач з імі. Раней гэта дазвалялася толькі ў спецыяльна адведзеных месцах. Удакладняецца, што гаворка ідзе не толькі аб санках, запрэжаных ездавымі сабакамі, але і аб спецыяльных калясках на колах. Чакаецца, што ў асноўным сабачымі запрэжкамі будуць карыстацца на прагулках і падчас актыўнага адпачынку. Падкрэсліваецца, што язда на сабачых запрэжках у Даніі — традыцыйнае мастацтва.

Па навуцы

«ТЭТРЫС» — НАЙЛЕПШЫ СРОДАК ДЛЯ БАРАЦЬБЫ СА СТРЭСАМ

Камп'ютарная гульня «Тэтрыс» даўно набыла культавы статус і стала прадметам шматлікіх даследаванняў і эксперыментаў. Зусім нядаўна навукоўцы з Вашынгтонскага ўніверсітэта выкарыстоўвалі гульню для дэманстрацыі тэхналогіі BrainNet, якая дазваляе кіраваць фігурамі пры дапамозе сілы думкі.

Часопіс Emotion апублікаваў вынікі новага даследавання, якое даказвае, што складванне розных фігур дазваляе хутка ўвайсці ў стан патоку і аслабіць напружанне ў стрэсавых сітуацыях. Даследаванне праводзілася ў Каліфарнійскім універсітэце горада Рыверсайд псіхолагам Кейт Суіні. Паводле яе слоў, патокавы стан дапамагае лягчэй перажыць стрэсавыя моманты жыцця, таму што людзі, якія знаходзяцца ў ім, губляюць пачуццё прасторы і часу і цалкам канцэнтруюцца на дзейнасці. Тэрмін быў прыдуманы ў 1975 годзе псіхолагам Міхалі Цысентміхалі, зачараваным мастакамі, якія ў працэсе творчасці забывалі нават паесці. На думку Кейт Суіні, «Тэтрыс» з'яўляецца найлепшай гульнёй для ўваходжання ў паток дзякуючы нарастаючай складанасці. Утрымліванне ўвагі і пастаянная матывацыя ўзмацняюць эфект — такая ж асаблівасць ёсць і ў некаторых мабільных гульнях.

Каб даказаць сцвярджэнне, даследчыкі далі пагуляць у «Тэтрыс» выпускнікам юрыдычных школ Каліфорніі, якія чакаюць вынікаў экзаменаў. Тое ж самае было рэкамендавана студэнтам, якія падалі заяўку на работу. У абодвух выпадках паддоследныя адчувалі менш турботы, пакуль былі сканцэнтраваныя на гульні.

Трэці эксперымент аказаўся самы цікавы. Даследчыкі папрасілі 290 студэнтаў запоўніць апытальнікі і здаць уласныя фатаграфіі. Ім сказалі, што іх даныя будуць перададзены навучэнцам з іншых універсітэтаў для ацэнкі іх прывабнасці. Зразумела, гэта выклікала моцны неспакой, але паддоследных падзялілі на тры групы і далі пагуляць у тры варыянты «тэтрыса». Першая група гуляла ў звычайную версію з паступова нарастаючай складанасцю. Другая была занятая лёгкім варыянтам, дзе фігуры апускаліся настолькі павольна, што выклікалі нуду. Трэцяй групе дасталася гульня з фігурамі, якія хутка падалі, з-за чаго студэнты хутка прайгравалі. Апытанне паказала, што гульцы ў звычайную версію з нарастаючай складанасцю хутка ўвайшлі ў стан патоку і выпрабавалі мінімум стрэсу.

Кейт Суіні адзначыла, што «Тэтрыс» не з'яўляецца панацэяй ад усіх трывог, але ў яго відавочна ёсць станоўчыя ўласцівасці. Гульня даступная практычна кожнаму чалавеку, таму лічыцца, што яна — нядрэнны пачатак для барацьбы са стрэсам.

Цёмнае мінулае

АНГЛІЧАНЕ ТАКСАМА ЗНАЙШЛІ АТЛАНТЫДУ?

Пошукавая кампанія з Вялікабрытаніі сцвярджае, што змагла знайсці руіны легендарнага патанулага горада непадалёк ад берагоў Іспаніі.

Брытанская пошукавая кампанія Merlin Burrows заявіла, што знайшла Атлантыду. Як лічаць у кампаніі, яе руіны знаходзіліся каля берагоў Іспаніі. Аднак гэтую заяву варта ўспрымаць з доляй скепсісу, таму што многія эксперты і раней дакладна паказвалі месцазнаходжанне горада, што ў выніку не пацвярджалася. Прадстаўнікі кампаніі настойваюць, што пасля аналізу даных са спадарожнікаў Landsat 5 і Landsat 8, а таксама даных Google Earth і работ грэчаскага філосафа яны высветлілі, што страчаны горад знаходзіцца ў Нацыянальным парку Даньяна. Яны прыйшлі да высновы, што гэта месца падыходзіць пад маляўнічыя апісанні Платона.

Генеральны дырэктар Merlin Burrows Брус Блэкбэрн расказаў, што пошукі ў гэтай галіне вяліся гадамі, і яго работнікі пастаянна шукалі падказкі. Іх цяжкая праца ў выніку прынесла плён, калі яны знайшлі нібыта рэшткі вежаў і храмаў Атлантыды. Гэтыя структуры былі пабудаваныя з бетону, які быў выраблены ад 10 да 12 тысяч гадоў таму, сцвярджаюць супрацоўнікі кампаніі. Як лічыцца, прыкладна ў гэты час і з'явілася Атлантыда. Merlin Burrows мае намер выпусціць дакументальны фільм, у якім яны хочуць абмеркаваць тое, што палічылі доказам сваіх заяў. Блэкбэрн сцвярджае, што яны з самага пачатку былі гатовыя да скепсісу з боку супольнасці. «Хтосьці скажа: «Гэта выдатна. Давайце паглядзім». Нехта ж, наадварот: «Гэта проста смецце», — упэўнены генеральны дырэктар. У той жа час гэтая заява здзівіла археолагаў і іншых навукоўцаў. Некаторыя выказалі здагадку, што знойдзеныя руіны, хутчэй за ўсё, належаць іншай культуры, астатнія папросту адмахнуліся ад гэтай ідэі. Іншыя каманды заяўлялі, што Атлантыда знаходзілася ў Балівіі, Турцыі, на Мальце і нават у Антарктыдзе.



Тэхналогіі

БЕЗ ГАНАРАРУ І ВОДПУСКУ

Новыя тэхналогіі ўсё больш актыўна ўкараняюцца ў жыццё чалавека. Яшчэ трохі, і многія звыклыя сферы дзейнасці будуць цалкам занятыя прадстаўнікамі штучнага інтэлекту (а ў некаторых абласцях і ўжо!). Цэнтральнае тэлебачанне Кітая паказала кібервядучага, які можа гаварыць, не запінаючыся, працуе колькі заўгодна і не сыходзіць на бальнічны.

Кітайскае агенцтва «Сіньхуа» прэзентавала першых віртуальных вядучых навін. У адрозненне ад людзей, гэтыя лічбавыя копіі могуць працаваць кругласутачна і адразу на некалькіх платформах. Прэзентацыя кібервядучых прайшла на Сусветнай канферэнцыі па кіраванні інтэрнэтам у правінцыі Чжэцзян. За аснову галаграмы быў узяты сапраўдны чалавек, вядомы ў краіне журналіст Цю Хаа. Аднак, як тлумачаць распрацоўшчыкі, прататыпам віртуальнага вядучага можа стаць любы чалавек — дастаткова толькі загрузіць у праграму відэа з яго выявай, і яна ў дакладнасці скапіруе жэсты, міміку і яго знешнасць.

Хоць стваральнікі кібержурналіста запэўніваюць, што з яго дапамогай можна зрабіць значна таннейшай вытворчасць навінавага кантэнту (робата не трэба грыміраваць, ён можа чытаць навіны 24 гадзіны ў суткі, не запатрабуе бальнічных і водпуску), далёка не ўсе тэлевізійныя дзеячы прыйшлі ў захапленне ад навінкі. І справа нават не ў канкурэнцыі, якой, вядома, не пазбегнуць. Многія з тых, хто праслухаў робата, заяўляюць, што даўжэй некалькіх хвілін вытрываць гэта немагчыма. «Ён вельмі плоскі, яго голас аднастайны — без рытму, тэмпу або акцэнту», — расказаў пра свае ўражанні ад прагляду Майкл Вуладрыдж з Оксфардскага ўніверсітэта.

Падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.